– У Белавежы арганізаваліся Агульнапольскія жывапісныя пленеры і тут усё пачалося. Мікола арганізаваў спачатку іх нават без вонкавых сродкаў. Быў такі ўпарты і так хацеў, каб пленеры ладзіліся ў Белавежы, што пакарыстаўся знаёмствамі з сябрамі з вышэйшай навучальнай установы ў Варшаве. Гэтыя пленеры расславілі Белавежу на свет, паколькі аказаліся міжнародным мерапрыемствам, – гаварыла жонка жывапісца **Галіна Валкавыцкая**. – Мікалай быў таксама суарганізатарам Міжнародных разьбярскіх пленераў у Гайнаўцы.

– Мікалай Валкавыцкі быў вельмі прыстойным чалавекам і вялікім творцам, а яго карціны гавораць самыя за сябе. Ён паклаў вельмі вялікія заслугі ў арганізацыі мастацкага жыцця ў Беластоку і рэгіёне, кіруючы працай Бюро мастацкіх выстаў. Быў ён стваральнікам і шматгадовым дырэктарам гэтага Бюро мастацкіх выстаў у Беластоку, пачынаючы ад 1965 года і належаў да Саюза польскіх мастакоў. Гэта ён запрапанаваў ладзіць мастацкія пленеры ў Белавежы і яны арганізаваліся тут ад 1965 года, да 2000 года. На гэтыя пленеры прыязджалі мастакі з Польшчы, Францыі, Іспаніі, Фінляндыі, Югаславіі, Германіі і Савецкага саюза. Мікола Валкавыцкі, як камісар, арганізаваў найбольш гэтых белавежскіх пленераў. Быў ён жывапісцам, хаця ў яго быў таксама дыплом па скульптуры і ў 1955 годзе Мікола нават паказваў на выставе ў Варшаве свае скульптуры выкананыя ў асфальце, нялёгкай скульптурнай тэхніцы. Аднак перш за ўсё быў жывапісцам. На карцінах Мікалая відаць сюррэалістычны свет, яго падыход да жыцця, яго настрой. Быў уражлівым чалавекам і чулым на тое, што адбывалася ў Польшчы і ў свеце і гэта мела ўздзеянне на яго творчасць, – расказваў гісторык мастацтва прафесар **Юры Гэрмановіч**.

– Мой дзядзька Мікола Вал-

кавыцкі гаварыў: «Я так малюю, каб кожны, хто гляне на мае карціны ведаў, што гэтыя працы выйшлі спад маіх рук». Я чула, што ў галоўным жывапіс дзядзькі называецца каларыстычным, а яго працы вялікія. Дзядзька гаварыў, што кожны павінен бачыць на яго карціне тое, што сам убачыць. Кожны мае права да сваёй індывідуальнай інтэрпрэтацыі. Дзядзька Мікола быў чалавекам працавітым, актыўным і аператыўным, многа арганізаваў выстаў і пачаў ладзіць белавежскія пленеры. Дзядзька Мікола памёр ў 2011 годзе і пахаваны на белавежскіх могілках па-суседску з маім бацькам, які памёр у 2013 годзе, а збоку пахаваная іх сястра Галіна, якая памерла ў 2015 годзе, – успамінала **Галіна Валкавыцкая-Далэнга**.

Сямейны дом Мікалая, перабудаваны і адсунуты далей ад дарогі, знаходзіцца насупраць гатэля «Зуброўка». Мікола тут нарадзіўся і вырас, тут перажыў вайну і пасля пайшоў вучыцца ў Мастацкую акадэмію ў Варшаве. Закончыў вучобу на напрамках жывапіс і скульптура і яшчэ тры гады вучыўся як аспірант. Захапляўся Белавежай і ў вольны час сюды прыязджаў. Ён тут заснаваў футбольную каманду і разгортваў спартыўную дзейнасць. Быў ён таксама заснавальнікам Народнага спартыўнага калектыву «Зубр», які дзейнічаў у Белавежы з 1952 года. Меў астацца працаваць у вышэйшай навучальнай установе, але вярнуўся на Беласточчыну. Вывучаў скульптуру і жывапіс у Акадэміі мастацтваў у Варшаве пад кіраўніцтвам такіх выдатных мастакоў, як **Марыян Внук**, **Францішак Стрынкевіч** і **Яўгеніюш Эйбіш**. У 1955 годзе дэбютаваў на Нацыянальнай выставе маладых мастакоў-візуалістаў «Супраць вайны – супраць фашызму» ў Варшаўскім Арсенале, якая стала прарыўной падзеяй у польскім пасляваенным мастацтве, парушыўшы тагачасную эстэтыку сацыялістычнага рэалізму. Некалькі гадоў быў намеснікам дырэктара ў Мастацкім ліцэі ў Супраслі і некалькі гадоў працаваў выкладчыкам у двухгадовай Настаўніцкай студыі ў Беластоку. Пазней стварыў Бюро мастацкіх выставаў у Беластоку. Спачатку ў аддзяленні культуры, у ваяводскай установе, атрымаў пісьмовы стол супольна з іншай асобай ад сельскагаспадарчых спраў. Знайшоў нішчэючы будынак, здабыў сродкі на яго рамонт і адкрыў там Бюро мастацкіх выстаў, дзе зараз знаходзіцца Галерэя «Арсенал». Шмат гадоў як дырэктар кіраваў працай гэтага бюро і ладзіў там выставы. Арганізаваў у «Сподках» Галерэю сучаснага мастацтва. Любіў ствараць новае і арганізаваў многа выстаў, карыстаючыся дапамогай сваіх сяброў з часоў вучобы ў Мастацкай акадэміі ў Варшаве. Прыватна Мікалай быў душа-чалавек, іграў на гітары, скрыпцы, акардэоне і быў у яго абсалютны слых. Пра сваё ма-

стацтва не гаварыў, але маляваў і паказваў свой жывапіс на выставах. Карціны Мікалая знаходзяцца ў розных музеях у Польшчы, за мяжой, але найбольш іх у Беластоку. Мікалай Валкавыцкі быў таксама намеснікам старшыні Управы беластоцкай акругі Саюза польскіх мастакоў.

Падляшскі музей і Галерэя Слендзінскіх таксама ўшанавалі мастака і арганізатара выстаў. Выстава арганізаваная ім сумесна – гэта спроба прадставіць шырокі зрэз творчасці мастака. Працы, прадстаўленыя ў ратушы, паходзяць з калекцыі Падляскага музея ў Беластоку. Сярод іх абстрактныя палотны канца 1960-х гадоў, якія з'яўляюцца працягам серыі светлавых карцін, у якую таксама ўваходзіць знакаміты «Кароль», прадстаўлены на 10-м салоне ў Парыжы ў 1969 годзе. Наступная група палотнаў гэта гарадскія пейзажы. Выкарыстоўваючы размытыя геаметрычныя формы, мастак малюе гарадскія будынкі і іх куткі, двары і пустыя вуліцы. Гэтыя працы маюць глыбока настальгічны, нават сумны сэнс. Пейзажы – найбольш шматлікія ў калекцыі Падляшскага музея ў Беластоку. Яны з'яўляюцца ўмоўным адлюстраваннем пейзажу, як бы намёкам на яго. Каляровая гама цёмная, пераважаюць халодныя зялёныя, фіялетавыя, сінія і шэрыя адценні, апраўленыя чорным, які мастак выкарыстоўвае, каб падкрэсліць драматызм сваіх твораў. Несумненна, менавіта гэтыя незвычайныя пейзажы прынеслі Мікалаю Валкавыцкаму найбольшае прызнанне. Творчасць Мікалая Валкавыцкага, заснаваная на падляшскім ландшафце і напоўненая эмацыйнай глыбінёй, з'яўляецца не толькі важным раздзелам у гісторыі мастацтва рэгіёну, але і сведчаннем успрымальнасці мастака да навакольнага свету. Яго карціны і сёння краналь-ныя, нагадваючы нам, што ад сапраўднага мастацтва нікуды не дзенешся. У 1968 г. паўстаў «Кароль» – карціна, якую Мікалай Валкавыцкі лічыў як адну з важнейшых у сваёй творчасці. Гэтая карціна – як адна сярод шасціасабовага прадстаўніцтва беластоцкіх мастакоў была прадстаўлена ў 1969 г. на дзясятым Парыжскім салоне. На гэтай памятнай, прэстыжнай выстаўцы беластачане атрымалі залатую медаль.

Як сказала браціха жывапісца Вера, Мікалай быў усебакова таленавітым мастаком, які заўсёды вяртаўся ў сваёй творчасці на радзіму. – Мы вельмі часта сустракаліся. Ён вельмі здольны кампазітар, скульптар, жывапісец. У „Ніве" была нават змешчана яго песня з нотамі, якую ён у Варшаве, як вучыўся, склаў і спяваў. Мікалай мог застацца працаваць у Варшаве (быў ад'юнктам у Мастацкай акадэміі), але ўсіх Валкавыцкіх цягнула сюды, на гэтую Беласточчыну.

– Брытанская каралева віншавала яго з удалымі карцінамі, – прызнаваўся брат Мікалая Георгій, старэйшы ад яго на два гады. – І гэтым ён ганарыўся. Партрэтаваў тату, маму, сястру. Для сваёй творчасці чэрпаў з рознага – шмат з Белавежжа, яго прыроды, вуліц, будынкаў, цэркваў, сажалак, роднага панадворка.

Мікалай Валкавыцкі быў узнагароджаны адзнакамі: 1966 Шчэцін – узнагарода на Фестывалі сучаснага жывапісу. 1968 Парыж – залаты медаль на Міжнародным салоне, 1970 Лодзь – узнагарода на конкурсе станковага жывапісу, 1972 – Залаты Крыж Заслугі, 1990 – Кавалерскі крыж Ордэна адраджэння Польшчы, 1995 – Залаты знак Заслугі перад Беласточчынай, «Заслужаны дзеяч культуры».

Радаслаў Маціевіч
фота **аўтара**

Датацыі на тутэйшыя помнікі

Маршалак Падляшскага ваяводства ўручыў чэкі з датацыямі на аднаўленне помнікаў даўніны ў Беластоку і Беластоцкім павеце.

Атрымалі іх м.інш.: Дабравешчанскі манастыр у Супраслі – 100 тыс. зл. на замацаванне ўцяплення падмуркаў з унутранага боку двара, Рымска-каталіцкая парафія Праабражэння Гасподняга ў Ялоўцы – 29 тыс. зл. на працы па аконнай сталярцы, на замену і дабудову вокнаў; Праваслаўны прыход Узвышэння Святога Крыжа ў Фастах – 50 тыс. зл. на знешнюю рэвіталізацыю храма, Рымска-каталіцкая парафія Божага Цела ў Суражы – 70 тыс. зл. на кансервацыя бакавога алтара св. Антонія, Медыцынскі ўніверсітэт у Беластоку – 48 тыс. зл. на будаўнічыя работы з кансервацыяй архітэктурных элементаў палаца Браніцкіх у Беластоку, Рымска-каталіцкая парафія Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Беластоку – 100 тыс. зл. на распрацоўку праекта рэканструкцыі даху і фрагмента фасада, Праваслаўны прыход св. апостала Іаана Багаслова ў Мастаўлянах – 80 тыс. зл. на рамонт даху, Рымска-каталіцкая парафія Св. Тройцы ў Тыкоціне – 100 тыс. зл. на працяг кансервацыі аргана, Рымска-каталіцкая парафія Св. Тройцы ў Супраслі – 35 тыс. зл. на кансервацыйныя работы левага бакавога алтара ў стылі неабарока, Рымска-каталіцкая парафія Тройцы ў Супраслі – 11 тыс. зл. на кансервацыйныя работы, Уршуля і Міраслаў Кавальчыкі – 30 тыс. зл. на перабудову ганка ў драўлянай сядзібе 1880 г. у Гарадку, Праваслаўны прыход Праабражэння ў Тапалянах – 77 тыс. зл. на царкву ў Фальварках-Тыльвіцкіх.

Радаслаў Маціевіч

Е. Двурнік, Коли познал єм Тереску, з колекциі Фундациі Едварда Двурніка / Пресовы материялы Музею Никыфора

В креницкым Музею ім. Никыфора мож обзерати выставу «Двурнік – Дровняк. Інспіраціі». Експозиция презентує артистичный діалоґ двох выдатных персон штукы ХХ ст. в Польщы: Едварда Двурніка, єдного з найважнійших сучасных малярів, та Епіфана Дровняка, ґеніяльного чыстого маляря – днес причысляного до найвыдатнійших представників европейского примітивізму.

Хоц привидні артистів ділило вшытко – походжыня, соспільный статус, едукация, творча дорога, то в іх штуці мож найти вельо спільных пунктів. **Едвард Двурнік**, абсольвент варшавскей Академіі Красных Штук скоро достерюг вынятковіст творчости **Никыфора**. Захоплював го спосіб, в якій креницкій артиста смотріл на світ, його незалежніст, а тіж велика здібніст перерабляня штоденности в язык малярскых символів.

Як раз тоты існпірациі сут основом выставы в Креници. Обік образів Никыфора, на котрых видиме пейжажы Креници, церкви, желізничны стациі ци сценкы з жытя, запрезентувано роботы Двурніка, якы навязуют до естетикы і мотивів творчости Дровняка. Зоставліня обох артистів позвалят пізріти на іх творы в новым світлі – не як далекы явиска, але як особливый діалоґ і артистичну выміну.

Едвард Двурнік (1943-2018) то єден з найбарже ціненых і розпознавальных польскых малярів, знаменитый рисовник і ґрафік. На другым роцї варшавскей Академіі Красных Штук, літом 1965 рока, в Кєльцях виділ выставу робіт Никыфора, котрых фантазийный реализм і ґротесковіст композициі го захопили. По роках признал, же «Никыфор был моім найважнійшым мастером, єдиным властиві. Николи не пережыл єм векшых емоций од тых, котры зродили його образы нажыво обзераны». Два рокы пізнійше Двурнік особисто познал Дровняка. «Посадили го на лавці, а він на никого не звертал увагы, лем рисувал, цілый час махал олівцьом, в несамовитым ритмі. Пак завезли го під готел Брістоль і Европейскій, на рынок Нового Міста, Стадийон Десятлітя і деси там іщы. Ішол єм за нима, а по парох днях зробил єм тоту саму трасу і рисувал тоты самы обєкты».

Двурнік нашол мастера, котрый го заінспірувал, але він сам был так само ориґінальный. Творил образы, котры укладал в ріжнорідны циклі. Малював абстракциі, не боял ся міряти з історичном проблематиком, деконструував іконічны образы Яна Матейкы, входил в полеміку з інчыма клясиками.

Його доробок обнимат веце як 8 тисячів шталюґовых образів і 20 тис. робіт на папері, за котры отримал чысленны нагороды, м.ін. Артистичной Критикы ім. Ц. К. Норвіда (1981), Комітету Незалежной Культуры «Солідарности» (1983) ци Coutts Contem-

porary Art Foundation в Цуріху (1992). Брал участ в престіжных выставах штукы в Парижы ци Берліні.

Выставу в Музею Никыфора зрыхтували на 130-літя народин Епіфана Дровняка, котре єст заєдно 60. річницьом одкрытя креницкого мастера Двурніком. Паралеля медже артистами находит ся в наголовку выставы. На експозиції мож выдіти 40 робіт Двурніка, в тым Русинок но 1, котрый артиста зробил по тым, як вышол з выставы робіт Никыфора в 1965 році (од того часу Двурнік датує початок свойой творчости), по характеристичны, полны чыстых кольорів образы видів міст з послідніх років діяльности.

В примірі Никыфора презентуваны сут роботы з першого періоду творчости, жебы вказати процес переформляня світа Дровняка через Двурніка. «Доріжкы, желіничны дворці, гірскы краєвиды ДровнякА, найчастійше позбавлены постати, інтуіцийні симетричны, ґрадацийні выполнены згашеныма кольорами, меляхолійні пространны, зас міста Двурніка пульсуют жытьом, сут заєдно репортажом і карикатуром, епатуют феерийом кольорів з домінуючыма ультрамарином, жолтым і червеным. Образы лучыт рисунковый спосіб унятя, зредукуваны до символу елементы натуры, зоставліня обік себе одлеглых реальности будинків і іх украшаня на потребы композиції і емоцийональне влияня» – подає куратор выставы **Славомир Майох**. «Роботы з колекції Фундації Едварда Двурніка та приватных колекций сут перемішаны в музейным просторі з роботами Никыфора, достали сме выняткový діалоґ двох мастерів».

Выставу мож обзерати до 21. листопада/новембра 2025 р.

Наталия Малецка-Новак
za lem.fm z 1.10.2025

Koncert Kapeli Radziwiłłowskiej

W reprezentacyjnej Auli Magna Pałacu Branickich w Białymstoku wystąpiła 29 września Kapela Radziwiłłowska. Było to wydarzenie artystyczne wysokiej rangi. Zabrzmiała muzyka barokowa, głównie tworzona w magnackiej rezydencji Radziwiłłów, jednego z najpotężniejszych rodów Wielkiego Księstwa Litewskiego, w Nieświeżu. Dziś to miasto leży w centrum Białorusi, w obwodzie mińskim.

Koncert zorganizowało Centrum Kultury Białoruskiej w Białymstoku (CKB), Stowarzyszenie Inicjatyw Kulturalnych „Mosty Inspiracji" oraz Fundacja Trzy Trąby (trzy trąby są herbem Radziwiłłów) z okazji 300-lecia odrodzenia w Nieświeżu radziwiłłowskiej kapeli.

Wystąpiła Classic-Modern Orkiestra pod dyrekcją **Aleksa Frałowa**, który jednocześnie wprowadzał w historię muzyki tworzonej w radziwiłłowskiej rezydencji, utworów wykonywanych przez kilkunastoosobową orkiestrę pod jego batutą. Głównie bowiem one znalazły się w programie. Ale wykonywano także utwory Bacha, Vivaldiego i Hollan-

da. Pieśni zabrzmiały w wykonaniu mezzosopranistki, operowej gwiazdy **Justyny Rapacz**.

Największy jednak aplauz kilkuset słuchaczy wzbudził wirtuoz skrzypiec **Artiom Szyszkow**, laureat dziewiętnastu międzynarodowych prestiżowych konkursów skrzypcowych, urodzony w 1984 roku w Mińsku i odbierający tam muzyczną edukację, warsztat doskonaląc także w Wiedniu. Naukę gry na skrzypcach zaczął w wieku pięciu lat, a już jako ośmiolatek miał solowy debiut na scenie Białoruskiej Państwowej Filharmonii. Teraz koncertuje w różnych krajach, występując z najbardziej znanymi w Europie orkiestrami i w najbardziej prestiżowych salach koncertowych. Gra na skrzypcach **Giovanniego Battista Gabrielli**, wykonanych w 1760 roku, przenosząc słuchaczy, także poprzez instrument, w głębię i piękno stuleci. Prowadzi klasy gry na skrzypcach, poczynając od Austrii i Niemiec, kończąc na Indiach i USA.

Jak dowiedziałam się od **Anatola Wapa**, dyrektora CKB, kierowana przez niego placówka zamierza zorganizować w przyszłości koncert skrzypcowy Artioma Szyszkowa.

Radziwiłłowska kapela została założona już w XVI wieku, ważnym dla nieświeskiej rezydencji. Wtedy, w 1533 roku, przechodzi z rąk **Mikołaja Niemirowicza**, któremu Nieśwież nadał król i wielki książę litewski **Kazimierz Jagiellończyk**, w ręce litewskiego rodu Kiszków. Po Annie z Kiszków Nieśwież przechodzi na własność jej synów – **Mikołaja Radziwiłła** „Czarnego" i **Jana Radziwiłła**.

Losy rezydencji to inna, ciekawa historia. Tu jednak warto wspomnieć, że stanowiła ona w Wielkim Księstwie Litewskim centrum życia kulturalnego – działała tu orkiestra, pisano dla niej utwory, działał teatr, dla którego powstawały sztuki. Sztuka rozkwitała tu intensywnie w XVIII wieku, już po dwudziestoletniej wojnie północnej ze Szwedami, zakończonej w 1721 roku, która spustoszyła ziemie WKL. I właśnie w tym powojennym okresie, w 1725 roku, następuje odrodzenie radziwiłłowskiej kapeli, co oznacza, że w tym roku wspominamy 300-lecie tego wydarzenia.

Wspaniały nieświeski zespół renesansowo-barokowy, zamkowo-pałacowy, otoczony fosą, został wpisany na listę światowego dziedzictwa kultury UNESCO. Republika Białoruś wydała ogromne pieniądze na jego restaurację i doprowadzenie do świetności. W połowie lat 90. widziałam go jeszcze w opłakanym stanie – wszystko się sypało i zarastało. Prace restauracyjne trwały piętnaście lat, do 2012 roku. Zespół udostępniono zwiedzającym i miłośnikom sztuki. Tu są organizowane koncerty muzyki dawnej, proponowane liczne wystawy, działa teatr im. Urszuli Radziwiłł. Ministerstwo kultury organizuje bale. Są zapraszani do Nieświeża goście najwyższej rangi.

Białostocki koncert zaszczycili swą obecnością potomkowie rodu Radziwiłłów.

Honorowymi patronami wydarzenia byli Marszałek Województwa Podlaskiego, Wojewoda Podlaski i Prezydent Miasta Białegostoku.

Anna Radziukiewicz
fot. **Facebook CKB**

Табе, Слова, кланяліся і верылі

Гэта Сакратава, Яновічава. З „Малітвы да роднага слова". І Яны ўсе, тыя, і Сакрат таксама, што адышлі ад нас на той бок, далей – «нават з таго боку ніву даглядаюць, свой вольны дух нашчадкам высылаюць», «у песні, што жаўруком узаўецца, што адзавецца і слязой, у сэрцы».

Яны адышлі, ды нас не пакінулі. Засталіся іх словы. Словы – якія мелі ўвекавечыць перш за ўсё ўсіх нас тут, на сваёй зямлі. Хоць бывалі яны, тыя словы, запісам няўпэўненасці і трывог аўтара, які, хацеўшы паказаць шлях, мог і памыліцца, і аступіцца, і заблукаць. Бывала, што быў вельмі самотны, хоць за ім стаяў народ, і кніжку яны мелі, – і ён, і той народ, які часта ды лёгка забываўся або і намерана станавіўся нярodным, чужым, а нават варожым, далёкім, калі нават акружаў паэта з усіх бакоў.

Міхась Шаховіч (1953-2000) напісаў: Усіх нас калісьці згэтуль вецер адкіне. Важна б – застаўся след у каляіне, і травы шапталі б успаміны ў даліне, і чырвані спелай не ўкралі б у каліны, і спевы плылі б аб прышласці нашай... І словы з ягонага верша з апошняй кнігі, выдадзенай пры яго жыцці (хоць ужо першая мела загаловак „Прамінанне") апынуліся на надмагільным помніку на гарадскім могільніку ў Беластоку на магіле паэта, які ў нестарыя гады пакінуў Бацькаўшчыну. Асаблівы сум агортвае сяброў і калег, калі адыходзіць творчы

чалавек у разгары сіл, шчыры прапаведнік ідэй, які не да канца яшчэ выявіў сваю патэнцыю і шмат мог бы яшчэ зрабіць не толькі для самых блізкіх асоб. Праз няпоўны год зусім недалёка ад магілкі сакоўскага Міхася, на копчыку жоўтага пяску леглі вянкі, сярод якіх красаваўся адзін з вершам па-беларуску – **Валодзі Дарашкевіча** (1941-2001) родам з Меляшкоў, пляменніка «нашаніўца» Янука Д. Той маёвы верш друкаваўся ў першай беларускай кнізе на Беласточчыне «Рунь» (1959). І так як вершы, якія чыталіся над магілай Шаховіча, і верш «Люблю» вызвалі стрымліваныя слёзы родных, знаёмых, меляшкоўцаў, бо свяціла маёвае сонца, і яны ж любілі сваё, што і памерлы паэт, і той *май, калі сады раскрыюць кветкі на ўвесь пах, а раз кашлаты дуб стары трапешча сонца ўгары...* Апошнія вершы прыслаў паэт у «Ніву» неўзабаве да свае неспадзяванае смерці, вярнуўшыся з далёкіх шляхоў, адрабіўшы свае чатырнаццаць прафесій. Дарыў ён вершы людзям да канца. У Меляшках пакінуў свой вялікі скрутак твораў у матулі, – каб нам перадала. Не меў ён пачуцця нейкай місіі паэзіі ды каштоўнасці таго, што стварыў. Гэта была проста радасць для душы ў далёкай старонцы. Лёг ён таксама сярод сваіх і не сваіх – на агульным гарадскім могільніку ў Беластоку, праз квартал да магілы іншага аўтара «белавежца» родам з суседняй гміны, Міхалоўскай, празаіка і ніўскага журналіста **Васіля Баршчэўскага** (1931-2000) з Бандароў. Запамятаўся ён гісторыямі пра тутэйшых моцных людзей, асабліва пра рыбакоўскага арэля Моцнага Янку.

Ішлі следам аўтары твораў пра тыповых і незвычайных нашых людзей, разважалі і над тыповымі рэдкімі сітуацыямі, як **Вінцук Склубоўскі**, вядомы юрыст, чалавек вялікіх ведаў і сэрца, аўтар апавяданняў з судовых аналаў, друкаваных у альманахах «Белавежы»і ў «Ніве». Пахаваны ён таксама на гэтым могільніку, непадалёк магілы ў радзе заслужаных пакойнікаў, дзе спачывае між іншым беларускі дзеяч і настаўнік **Мікалай Самоцік**.

На суседнім з гарадскім беластоцкім могільніку на Выгодзе кожны свядомы беларус знаходзіць дарогу, між іншым, да **Юркі Геніюша** (1935-1985) – ідучы сцежачкай за храмам убачыць цяпер не магілу каля крыжыка хлопчыка, памерлага сто гадоў раней яго – паэта і педыятра, а мармуровы бліскучы помнік з месцам на дзве асобы. А побач беларускіх слоў – здымак яго самога, маладога, элегантнага і дасціпага, пана доктара, сына Ларысы Антонаўны з Зэльвы, чый лёс адбіўся і на ягоным. Юрый Геніюш, патомны інтэлігент, адчуваўся ім і ў літаратурных творах, і ў побыце, на літаратурных сустрэчах Беларускага літаратурнага аб'яднаная, якое яднала перш за ўсё тых, чый бацькоўскі парог быў у вёсцы. Так як і **Міколы Гайдука** (1931-1998) родам з Кабылянкі пад Міхаловам, педагога, краязнаўцы, журналіста, паэта, празаіка. Як жа шчыра і апантана адкрываў ён нам нашы мясціны і лёс! Сярод магілак блізкіх і родных пісьменніка – ружовы арыгінальны хоць невялікі крыж, ля падножжа якога, нізка, проста і ясна напісана: Мікола Гайдук. Побач яго спачыла ягоная спадарожніца жыцця таксама на беларускіх сцежках – настаўніца **Лідзія Гайдук**. Іншых слоў больш і не трэба.

Ідучы праваруч ад магілы дзядзькі Міколы, больш у бок вуліцы Высоцкага, трапім на магілку іншага шчырага і апантанага добрым і трапным словам беларуса – вядомага журналіста **Віктара Рудчыка** (1934-1989), які таксама друкаваў свае апавяданні ў альманахах «Белавежы». А бліжэй да выхаду у могільніка – магіла вядомага беларускага палітыка **Міколы Чарнецкага**. А лявей ад яго – магіла **Сцяпана Копы** (1945 -2023) які па крышынцы збіраў родную песню. І яго спадчыну цяпер мы збіраем.

Сярод сваіх, беларусаў, пахавана таксама паэтэса **Марыля Базылюк-Саснюк** (1959-1996) родам з Кленік – у Бельску-Падляшскім. Сярод праваслаўных, ды ў Варшаве, пакоіцца паэтэса **Люся Анхім** (1965-1996) з Каляснога, і на два пакаленні старэйшая ад яе **Алена Анішэўская** родам з Белавежы. А на ляўкоўскім могільніку пасярод бору, побач з бацькамі спачыў у 2012 годзе **Уладзімір Гайдук**.

У Гайнаўцы ў роднай зямлі чакаюць нас **Алёша Харкевіч** і **Сцяпан Карбоўскі**. Не ўсё яны паспелі сказаць. Сцяпан Карбоўскі, які нарадзіўся ў вёсцы Чахі-Забалотныя Гайнаўскага павета, рупны гаспадар, здольны прадпрыемца, займаўся і замежным гандлем. Дэбютаваў у “Ніве” (1962). Пісанне адкладваў на пазней, калі ўстроіць усе сямейныя справы, паможа сынам. Пісаў у „Ніву” фельетоны, апавяданні праз сорак гадоў. І стаў спісваць успаміны са свайго турботнага і багатага жыцця. На жаль, лёс спыніў яго жыццё і планы раптоўна. Засталося няшмат у хатнім архіве гэтага выдатнага чалавека і беларуса, шчырага прыхільніка беларушчыны, таленавітага гайнавяніна з вуліцы Герояў Варшавы...

Аж у Глівіцах апынуўся быў найстарэйшы «белавежац» народжаны яшчэ ў XIX стагоддзі – Антось з Лепля (**Антон Васілеўскі** – 1891-1984), там і пахаваны гэты вядомы празаік, паштар і прыродны медык.

А ў Рагозьне пад Познанем, у 95 гадоў, спачыў адзін з заснавальнікаў беларускага літара-

Могілкі ў Крынках, дзе пахаваны Сакрат Яновіч

турнага руху ў Польшчы **Алесь Свісёк** (Аляксандр Батура).

Некаторыя з іх спачылі далёка ад роднай зямлі, але ў зямлі якая стала іх роднай – як **Ада Чачуга** (1937-2008), з роду мінскіх Матусэвічаў, якая ўсё спелае жыццё была з беларускім словам у «Ніве».

А **Сакрат Яновіч** (1936 -2013) у сваіх Крынках, **Георгій Валкавыцкі** (1926-2013) у сваёй Белавежы, айцец **Рыгор Сасна** і **Янка Чыквін** у старынным Бельску, **Язэп Карпюк** у Сямятычах, **Ніна Цыванюк** у Гарадку, **Міран Хадакоўскі** у Супраслі.

Імёны некаторых з іх увекавечаны на вуліцах, пляцах. Словы некаторых пабудавалі вечныя будынкі, як музей Кастуся Майсені. Не ўсе іх словы запісаны ў векапомных кнігах ці ў песні што стала народнай. Некаторыя з іх са свайго, «нарваўскага боку», як **Мікола Лук'янюк** з Бялкоў, **Уладзімір Клюмюк** з Плянты, **Фёдар Хлябіч** з Рыбакоў, **Міхась Красоўскі** з Малынкі і іншыя дакладвалі сваё важкае слова, народнае слова, да старонкі нашага тут быцця.

І спрыялі ім іхнія хатнія звычайныя беларускія анёлы – як **Таня Яновіч**, **Клаўдзія Петручук**, **Галіна Твараповіч**, **Валя Вярбіцкая**...

І з родным словам у песні – як **Ніна Цыванюк**, **Уладзімір Іванюк**, **Ірэна Паўлючук** – усё жыццё.

Засталося недаказанае – у скрутках папер, якія варта пераглянуць, уратаваць – словы ад Ніны, Алены, Сцяпана, Міколы, Уладзіміра, Сакрата, Рыгора, Юркі...

Кожны з Іх, і шмат іншых, застаўся ў беларускім сузор'і і пакінуў след у каляінах нашых дарог. І ў нашым сэрцы. Не забудзьма і мы дарогі да Іх!

Міра Лукша
фота **Ганны Радзюкевіч**

Sami o Sobie. Miesięcznik społeczno-kulturalny. Dodatek do Przeglądu Prawosławnego
Współfinansowany ze środków dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji
oraz Fundacji im. Księcia Konstantego Ostrogskiego
ISSN 1899-9018 Nr indeksu 371416
Wydawca: Fundacja im. Księcia Konstantego Ostrogskiego
Redaguje zespół: Eugeniusz Czykwin (redaktor naczelny)
Doroteusz Fionik, Ałła Matreńczyk, Anna Petrovska
Anna Radziukiewicz (zastępca redaktora naczelnego)
Opracowanie graficzne: Anna Radziukiewicz, Halina Kierdelewicz
Skład komputerowy: Halina Kierdelewicz
Adres redakcji: 15-399 Białystok, ul. Składowa 9; tel./fax (0048 – kier. z zagranicy) 85 742 18 57
e-mail: redakcja@przegladprawoslawny.pl; www.przegladprawoslawny.pl
Publikacja wyraża jedynie poglądy autora/-ów i nie może być utożsamiana z oficjalnym stanowiskiem Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji. Публикация выражает лем погляды автора/-ів і не может быти ідентифікувана з офіцыяльным становиском Міністра Внутрішніх Справ і Адміністрациі. Публикация выражает только точку зрения автора/-ов и не может быть отождествлена с официальной позицией министра внутренних дел и администрации. Публікація виражаеть лише точку зору автора/-ів і не можеть ототожнюватися з офіційною позицією Міністра внутрішніх справ і адміністрації. Публікацыя выказвает толькі меркаванні аўтара/-аў і не может быць ідэнтыфікавана з афіцыйнай пазіцыяй Міністра Унутраных Спраў і Адміністрацыі.